# ЗАПРАШЭННЕ Ў «КРАІНУ»

Асноўная задача вучэбнага і выхаваучага працэсу — выхаванне сапраўднага грамадзяніна сваёй дзяржавы, які любіць, шануе і паважае сваю краіну. А шанаванне, любоў і павага з'яўляюцца толькі на аснове ведання гісторыі, культуры, мовы.

Кожная нацыя, кожны народ мае тое адметнае, па чым мы пазнаём прадстаўнікоў пэўных этнасаў, якія ў нашай свядомасці трывала асацыіруюцца з пэўнай краінай і яе жыхарамі. Так, італьянцаў нам цяжка ўявіць без традыцыйнай пасты на абедзеным стале, а англічан — без пудынгу. Сакура ў нашай свядомасці звязана з Японіяй, а бярозка — з Расіяй. Карыда — нацыянальная адметнасць Іспаніі, а фіёрды — Нарвегіі.

Беларусь не з'яўляецца выключэннем. Васілёк, апеты Максімам Багдановічам, зубр — Міколам Гусоўскім, вядомы ў свеце лён, бусел, бульба — усё гэта сімвалы, якія ідэнтыфікуюць нашу краіну ў стракатым шматнацыянальным свеце. А чаму менавіта яны і што мы ведаем пра іх? Пошук адказаў на гэтыя пытанні і стаў штуршком для ідэі, якую распрацавалі і ажыццявілі студэнты факультэта народнай культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Сутнасць ідэі — у пошуку і конкурсным прадстаўленні ведаў пра найбольш значныя з'явы беларускай культуры. Ідэя знайшла сваё увасабленне ў праекце «Краіна», першым крокам у рэалізацыі якога стала Свята бульбы, праведзенае на факультэце ў кастрычніку 2007 года.

Форма правядзення мерапрыемства абумоўлена некалькімі прычынамі. Як вядома, веды лепш засвойваюцца, калі яны здабыты самастойна, а не дадзены ў гатовым выглядзе. Таму ўдзельнікі праекта атрымалі магчымасць заняцца самастойнай навукова-даследчай і пошукавай дзейнасцю.

Розная накіраванасць заданняў дала магчымасць удзельнікам праявіць творчыя, спартыўныя і інтэлектуальныя здольнасці незалежна ад узросту, фізічнай падрыхтоўкі і узроўню адукацыі.

Распрацоўка сцэнарыя, падрыхтоўка свята аб'ядналі студэнтаў розных курсаў, спецыяльнасцей і факультэтаў, далі неацэнны педагагічны вопыт у правядзенні калектыўнай творчай справы.

Першая задача, якая стаяла перад арганізатарамі, — прадумаць канцэпцыю свята. Усе мерапрыемствы праходзілі ў выглядзе конкурсаў, якія ацэньвала незалежнае журы. Свята складалася з трох этапаў — творчага, спартыўнага, інтэлектуальнага, кожны з якіх атрымаў сваю назву: «Асамблея», турнір «Залатая бульба», «Навуковы кангрэс». За кожны конкурс каманды атрымлівалі не балы, а дранікі. Колькасць дранікаў залежала ад складанасці заданняў: так, творчыя конкурсы ацэньваліся ад 1 да 4 дранікаў, за заданні інтэлектуальнага цыкла каманды маглі атрымаць да 10 дранікаў.

Асноўная ідэя свята, што аб'яднала усе конкурсы, — стварэнне Бульбяной дзяржавы, у якую мы і запрасілі нашых гасцей. Прадумалі і адпаведнае афармленне залы: на творчым этапе дзеянне адбывалася ў карчме; зразумела, што спартыўныя мерапрыемствы прайшлі ў спартыўнай зале, выстава кніг пра бульбу была падрыхтавана Бульбяной акадэміяй навук. На кожным этапе вызначалася лепшая каманда, а па выніках усіх трох этапаў камандзе-пераможцы уручаўся галоўны прыз.

Правядзенню свята папярэднічаў значны падрыхтоўчы этап, на якім кожная каманда павінна была сабраць як мага больш разнастайных звестак пра бульбу.

Такія значныя мерапрыемствы, як правіла, не абыходзяцца без падтрымкі звонку. Наша ідэя знайшла водгук у кіраўніцтва групы кампаній «Анега», якая прадставіла ў якасці прызоў для усіх удзельнікаў сваю прадукцыю, за што мы ім вельмі удзячныя.

Як паказаў вопыт, праект «Краіна» унікальны па задуме і вельмі просты ў рэалізацыі. Сведчаннем таму стала правядзенне Свята бульбы ў СШ № 153 г. Мінска.

Спадзяёмся, што наш вопыт будзе карысным для іншых школьных і пазашкольных устаноў. Мы прапануем чытачам наш сцэнарый свята.

***А. С. Васілеўская**, намеснік дэкана факультэта народнай культуры па навуковай рабоце*